Таксама ў межах фестывалю быў арганізаваны карагод народных забаў «Традыцыі продкаў нашчадкам пакінем», на якім удзельнікі фестывалю прадстаўлялі конкурсныя гульнёвыя праграмы, якія складзены з народных гульняў і забаў, прымеркаваных да народнага свята «Масленіца». Пераможцам гэтага конкурсу стаў дзіцячы творчы калектыў Новаслабодскага сельскага клуба Слаўгарадскага раёна.

***Кухціна І.Г.,***
***дырэктар ДУА «Дзіцячая школа мастацкіх рамёстваў і мастацтваў г.Быхава»***

# А наша вандроўка – па сёлах

**У дзяржаўнай установе культуры «Цэнтралізаваная клубная сістэма Краснапольскага раёна» падведзены вынікі конкурсу «А наша вандроўка – па сёлах» па экспедыцыйнай дзейнасці сярод спецыялістаў клубных устаноў.**

Фальклорныя, этнаграфічныя экспедыцыі можна лічыць самым каштоўным і галоўным сродкам вывучэння, захавання самабытнай народнай культуры, сродкам стымулявання прафесійна-творчай актыўнасці, набыцця спецыяльных навыкаў і ведаў у вобласці народнага мастацтва і прафесійнай дзейнасці па актуалізацыі і папулярызацыі фальклорна-этнаграфічнай спадчыны.

Конкурс праводзіцца з мэтай захавання фальклорна-этнаграфічнай спадчыны свайго рэгіёна; актывізацыі дзейнасці клубных устаноў па краязнаўчай, экспедыцыйна-збіральнай дзейнасці; фарміравання вопыту работы па актуалізацыі і папулярызацыі збораў; абмена вопытам работы, распаўсюджання лепшых узораў майстэрства; стымулявання прафесійнай і творчай дзейнасці, яе ўдасканаленне.

Конкурс быў пабудаваны на ацэнцы некалькіх аспектаў экспедыцыйнай дзейнасці: ацэньваліся справаздачныя матэрыялы за мінулы год, творчыя работы па актуалізацыі экспедыцыйных збораў, формы і сродкі папулярызацыі вынікаў экспедыцый.

Конкурс паказаў, што ўзровень папулярызацыі і актуалізацыі вынікаў экспедыцыйных збораў павысіўся: зборы не застаюцца ў схованках, спецыялісты клубных устаноў знаходзяць розныя формы іх «абнародвання», увядзення ў жыццё, узрос узровень папулярызацыі збораў праз напісанне эсэ, артыкулаў,



рэфератаў, публікацый, выступленняў на радыё, справаздач.

Вынікі конкурсу падведзены па намінацыях.

У намінацыі «Лепшы матэрыял па папулярызацыі экспедыцыйных матэрыялаў» адзначаны:

дыпломам I ступені Марчанка В.А., метадыст 1 катэгорыі Краснапольскага РЦК;

дыпломам II ступені Гомарава В.І., дырэктар Горскага СДК;

дыпломам II ступені Яфімчык Т.В., мастацкі кіраўнік Тур’яўскога СДК.

У намінацыі «Лепшая творчая работа па актуалізацыі экспедыцыйных матэрыялаў» адзначаны:

дыпломам I ступені Марчанка В.А., метадыст 1 катэгорыі Краснапольскага РЦК;

дыпломам II ступені Кандрацэнка А. Ул., мастацкі кіраўнік Ленінскага СДК;

дыпломам II ступені Крапіўніцкая Л.В., дырэктар Яноўскага СДК.

Прадстаўляем вашай увазе матэрыялы пераможцы конкурсу Марчанка В.А. «Асаблівасці фальклорнай песеннай спадчыны беларуска-рускага памежжа. Краснапольска-краснагорскі рэгіён» і «Калеча-малеча, колькі часоў да вечара?..», або вобразы дзіцячага фальклору малой радзімы.

# Асаблівасці фальклорнай песеннай спадчыны беларуска-рускага памежжа. Краснапольска-краснагорскі рэгіён

Фальклор – жывы летапіс пра далёкае гістарычнае мінулае і ў той жа час – гэта гучны голас сучаснасці. Гэта духоўны капітал, скопішча мудрасці і шматвяковага вопыту народа, найвялікшая каштоўнасць любой краіны, якую трэба берагчы і развіваць. Праз фальклорныя песні захоўваецца багацце жывой народнай мовы, гістарычная і культурная спадчына таленавітых продкаў, самабытнасць краю.

На паўднёва-усходняй частцы Краснапольскі раён Магілёўскай вобласці Беларусі мяжуе з Краснагорскім раёнам Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Бліжэйшыя вёскі Краснапольшчыны, што знаходзяцца на памежжы, – Яноўка, Леніна, Выдранка, Горы, інш; вёскі Краснагоршчыны – Ярмоленка (не існуе з 2006 года), Зарэчча, Кібіршчына, Марозаўка, Ларняўск, інш. На гэтай памежнай тэрыторыі сфарміраваўся ўнікальны фальклорна-песенны пласт народнай культуры. Песенны фальклор гэтага памежжа, яго асаблівасці і сталі прадметам збірання і вывучэння для аўтара работы – метадыста ДУК «ЦКС Краснапольскага раёна» В.А.Марчанка, кіраўніка народнага фальклорнага ансамбля «Горскія харашухі» в.Горы.

Вядома, што на творах фальклору заўсёды ляжыць пячаць таго часу і таго асяроддзя, у якім яны доўгі час жылі або бытавалі.

Рэгіён краснапольска-краснагорскага памежжа – гэта рэгіён з цяжкавызначальнай этнічнай прыналежнасцю. Тут адбывалася і адбываецца цеснае этнакультурнае і сацыяльнае ўзаемадзеянне. У вёсках было і ёсць нямала змешаных руска-беларускіх шлюбаў, таму сямейны быт, сямейныя святы і абрады ўзбагачаліся і ўзбагачаюцца новымі мастацкімі фарбамі, якія накладваюць свае адценні на творы агульнаславянскага пласту.

Не адно стагоддзе абмену культурнымі здабыткамі на гэтай тэрыторыі спрыялі і такія з’явы, як аднадзённыя і шматдзённыя кірмашы (у вёсках Мядзведзі, Калюды, Пералазы, Горы і інш.). У вёсцы Горы кірмаш, які адбываўся ў дзень правядзення народнага свята пакланення крыніцам Дзясятухі (у дзясятую пятніцу пасля Пасхі), збіраў гандляроў і пакупнікоў з Беларусі, Расіі, Украіны, нават Польшчы. У час кірмашоў сустрэчы родзічаў і знаёмцаў з розных куткоў станавіліся і творчымі сустрэчамі, на якіх гучалі песні і выконваліся танцы пад найгрышы народных інструментаў.

У чым жа асаблівасць песеннай фальклорнай спадчыны памежжа Краснапольшчыны і Краснагоршчыны? Якая яна, песенная традыцыя гэтага рэгіёна?

Фальклорныя творы памежжа маюць нямала агульных асаблівасцяў, хоць могуць існаваць і ў крыху розных

варыянтах, бо для фальклору характэрна варыятыўная рухомая прырода. Як казаў В.Р.Бялінскі, «…і пераходзіць песня з роду ў род, ад пакалення да пакалення; і змяняецца яна з часам: то скароцяць яе, то ўдліняць, то пераробяць, то злучаць яе з іншай песняй…»

Цяжка дакладна высветліць паходжанне многіх твораў фальклорнай спадчыны памежнага рэгіёна. Якім народам былі народжаны гэтыя песні: «Як паехаў мой мілы ў дарогу», «Што й па морю», «Расцвіла ў лузе лаза», «Вецер вее», «У садзе груша расла», «Ой, там на гарэ» і інш. – рускім ці беларускім?

Жанравая ж разнастайнасць фальклорных песень памежжа такая: сямейна-абрадавыя (асабліва – вясельныя), каляндарна-абрадавыя, лірычныя (пазаабрадавыя), казацкія, рэкруцкія і песні ваенных гадоў, баладныя, прыпеўкі, песні, звязаныя з рухам (карагод, песня-гульня, шэсце), калыханкі.

Для больш дасканалага раскрыцця пачуццяў у фальклорных песнях выкарыстоўваюцца розныя сродкі мастацкай выразнасці: эпітэт, паралелізм, параўнанне, гіпербала, літота, экспрэсіўная лексіка, інш. Напрыклад: «Ой, белая лябёдачка ваду замуціла» – «Нясчасная мая доля – замуж захацела»; «З поля ветры дзьмуць» – «З чужой стараны госці йдуць» – гэта прыклады вобразнага паралелізму; «Зыбнула морічка, зыбнула, там наша Танечка ўтанула» – (дзяўчына выйшла замуж); «Барусечка мой чорненькі» (зварот да жаніха); «Забіраеце наша серябро» (нявесту) – прыклады метафары; «Голай галавой боб малаціць» – іронія; «Ой, то ні конічык – цялёнак, ой, то ні жаніх – дзіцёнак» (літота і паралелізм); «Ганначкі радня слёзкі лле» – метанімія, інш.

Характар апавядання ў песнях – маналагічны або дыялагічны («Дазволь, маці, удаву браці», «Не дазволю ўдаву браці»). У будове твораў: запеў – сказ – канцоўка; форма твораў – куплетная. Многія з песень па змесце горысныя, сумныя, заканчваюцца распевам «о-хо-хо», маюць словы «ой». («Як паехаў, ой, мой мілы ў дарогу, о-хо-хо»). Пэўна, гэта адбітак умоў жыцця і нескладанасцяў лёсу чалавека, ці навогул – з’яў глыбока правінцыяльнага краю, «літоўскай пустэчы», як у свой час называлася Краснапольшчына, ды розных падзей гісторыі народа і чалавечага жыцця.

У фальклорных песнях памежжа шырока прадстаўлены дыялектныя словы, песні насычаны ўстарэлымі словамі, простамоўнымі («брэшыш», «дурыць», «нікагенька», «добря»).

Фальклор памежжа мае фанетычныя асаблівасці, якія прадстаўлены дужа шырока. Гэта з’ява робіць мову памежжа асаблівай, якую называюць «трасянкай». У памежным фальклоры рускай тэрыторыі назіраюцца фанетычныя асаблівасці беларускай мовы. У якасці прыкладаў прывядзём толькі некаторыя з іх: постфікс –ся ў дзеясловах: даждуся; усячэнне –т у дзеясловах 3-й асобы адзіночнага ліку: рве, кіня; наяўнасць в-: вакно, вуліца, вочы; замена галосных: піце, сабе, пяём, глыбокая; яканне: дзяржыць, сядзела, мяне; змяненне націску: памёрла, дачка, не было, нікому; зацвярдзенне зычных: крэпкі, скарэй, «ўрэмя», грыбы, бяры; або змякчэнне зычных у беларускіх словах на рускі манер; замена з на ж: дражнілі;

інш. На той і другой тэрыторыі памежжа ўжываюцца іншамоўныя словы. Такія «няправільнасці» мовы ствараюць аўтэнтычную непаўторнасць і прыгажосць фальклору, пазнавальнасць рэгіёна.

Асаблівасці фальклорных песень краснапольска-краснагорскага памежжа ёсць і ў іх выкананні. Часцей яны спяваюцца без музычнага суправаджэння, валодаюць імправізацыйнасцю. Яны могуць мяняць настрой, характар, танальнасць, тэмп – усё залежыць ад сітуацыі і настрою спевака-пачынальніка. Многія з песень пачынае запяваць адзін голас (пачынальнік), які потым падхопліваюць іншыя галасы (абавязкова сярод іх – галаснік). Многія песні спяваюцца на два або больш галасоў, якія прыгожа разгортваюць мелодыю. Для рэгіёна характэрна працягласць гукавядзення, што робіць творы меладычнымі, пявучымі, плаўнымі і прыгожымі. Распеўнасць дасягаецца распевам, калі на адзін слог даводзіцца некалькі гукаў.

У песнях часта сустракаюцца паўторы цэлых радкоў. Бывае, што апошні радок аднаго куплета становіцца пачаткам другога. Гэта спрыяла лёгкаму запамінанню.

У некаторых творах ёсць абрывы слоў, калі слова не дапяваецца цалкам. Напрыклад: «Казак да дзяўчыны што й вечара хо…» – (замест «ходзя»).

Для песень характэрна шырокая напеўнасць, меладычнасць, пачуццёвасць, павольнасць, якія прымушаюць да роздуму. Што і казаць, многія з іх нараджаліся і спяваліся пад час выканання доўгай працы – у час жніва, калі



браўся лён, або пад гудзенне пралкі ці за кроснамі доўгімі зімовымі вечарамі. Вось дзе жанчыны маглі выказаць свае пачуцці і думкі, паскардзіцца на горкі лёс. Адкрытасць і палётнасць характэрны для абрадавых песень, якія спяваліся на адкрытай прасторы. Голас павінен быў ляцець у паветры, дасягаць далечыні – гэта быў зварот да Бога, сонца, поля, мора, інш («Памажы нам, Божа, вясну загукаці», «Вясна-вяснуля, дзе ты заснула, гу-у-у» і інш.).

Такім чынам, мяжа этнакультурнай прасторы не супадае з мяжой геаграфічнай; фальклор існуе выключна ў дыялектнай форме, у форме мясцовых, вузкалакальных варыянтах; фальклорныя песні краснапольска-краснагорскага памежжа блізкія па сваім характары, музычных і зместавых асаблівасцях, па жанрах.

***Валянціна Марчанка,***
***метадыст 1-й катэгорыі РЦК***
***ДУК «ЦКС Краснапольскага раёна»***

# «Калеча-малеча, колькі часоў да вечара?..», або вобразы дзіцячага фальклору малой радзімы

Непаўторная мясцовая гісторыя ці фальклорная спадчына не можа быць беднай ці багатай, цікавай або нецікавай. Трэба толькі прыгледзіцца, пашукаць, знайсці ці ўспомніць і абавязкова захаваць яе. Бо нашы нашчадкі, калі яны запытаюцца пра мінулае, не павінны знайсці зарослую травой забыцця спадчыну свайго народа і сваёй малой радзімы.

Мінулае цікавае не толькі неардынарнымі з'явамі, здарэннямі і знешне прывабнымі атрыбутамі, але і сваім зместам, сваёй сутнасцю, захаванасцю ў чалавечай памяці…

Народная мудрасць і творчасць выступаюць у фальклоры – казках, песнях, абрадах, гульнях, забавах – праз розныя вобразы. З далёкага майго дзяцінства засталіся ў маёй памяці такія з іх, як «Калечына-малечына», «Баба-калечка», «Старчык-мальчык», «Ікаўка», «Дзед», «Мышка» і іншыя.

«Калечына-малечына» была пастаяннай забавай для нас, вясковай дзятвы. І гулялі ў яе выключна ў час, калі пасвілі вясковых кароў. У вёсцы была ўстаноўлена «рядоўка» – чарга, па якой кожны двор, які меў у сваёй гаспадарцы жывёл, вылучаў з ліку членаў сям'і пастухоў, якія пасвілі вясковую скаціну – кароў, цялят, авечак. З маленства такімі пастухамі станавіліся і мы – дзеці. За доўгі дзень пасцьбы ў якія толькі гульні і забавы мы не гулялі! А калі пачыналі сумаваць, з нецярплівасцю пыталіся: «Калечына-малечына, сколькі часоў да вечара?».

Хто ж яна такая – «Калечына-малечына»? Гэта звычайны пастухоўскі кій. Менавіта яго мы ставілі на ўказальны палец, утрымлівалі кій вертыкальна і, звярнуўшыся да яго, задавалі сваё пытанне, пасля якога лічылі гадзіны: «Адзін, два, тры, чатыры…». На якім ліку кій валіўся, столькі гадзін і заставалася да вечара, да канца пасцьбы.

Акрамя «Калечыны-малечыны» быў яшчэ і вобраз «Баба-калечка».

«Бабу-калечку» мы прасілі нас сагрэць. Справа ў тым, што ўсё дзяцінства ўлетку мы плёскаліся ў балоце. Плёскаліся да пасінення! А потым, калі выходзілі на мураваны лужок, прыкладалі да вуха далонь, нахілялі на той бок галаву, скакалі на адной назе і прыгаворвалі: «Баба-калечка, сагрэй чалавечка, еслі не сагрэеш, сама пакалееш». Так вытрасалася вада з вуха, а мы саграваліся ад сваіх скокаў то на адной, то на другой назе.

Па «малюнку» на далоні пасля купання і па звароту да «Бабы», «Дзеда», «Серенькага мядзведзя» мы атрымлівалі «прагноз пагоды» на наступны дзень. Спачатку ўсё рабілася, як і ў дзеі «Баба-калечка», толькі прыгавор быў такі: «Калдуй, Баба, калдуй, Дзед, калдуй, Серенькі мядзведзь, – ці на хмару, ці на цень, ці на ясны дзень. Якая заўтры будзя пагода?» Потым адымалі далонь ад вуха і разглядалі адбітак на ёй. Калі далонь была светлая, мы радаваліся «прагнозу» – будзе ясны дзень. Калі на далоні былі плямы, часам сінія ад нашага пераахаладжэння, мы хмурыліся, бо гэта прадвесціла пахмурнае надвор'е ці дождж. А мы ж марылі пра купанне і на наступны дзень. І купаліся, як казалі, уволю, бо дарослыя былі на рабоце ў полі, а мы даглядалі адзін аднаго, пасвілі гусей і амаль увесь дзень належылі самі сабе.

Да «Бабы», «Дзеда», да «Серенькага мядзведзя» мы звярталіся і тады, калі клапаціліся аб выкананні нейка-

га жадання, ці збіраліся даць абяцанне пра што-небудзь. І тады казалі, напрыклад, так: «Калдуй, Баба, калдуй, Дзед, калдуй, Серенькі мядзведзь, мы не будзем біцца», або: «Калдуй, Баба, калдуй, Дзед, калдуй, Серенькі мядзведзь, ніхай матка (маці) не балее». Гэта былі і нашы дзіцячыя малітвы, і нашы абраканні, і іншыя магічныя дзеянні.

Яшчэ можна было звярнуцца да «Старчыка-мальчыка». Гэта было ў тым выпадку, калі ў вока трапляла парушынка. Тады трэба было закрыць вока, узяцца двума пальцамі за вейкі, дзёргаць іх у такт слоў і прыгаворваць: «Старчык-мальчык, вынь сурынку, еслі не вынеш, самому засурю».

Калі ж на чалавека нападала ікаўка, то трэба было на адным дыханні некалькі разоў прамовіць: «Ікаўка, Ікаўка, стань у варот, хто будзя йіціць, ты тому скок у рот».

«Мышка, Мышка, на табе зуб лубяны, а мне дай касцяны», – прасілі мы мышку і кідалі ў запечак выпаўшы малочны зуб.

Калі добра падумаць і паразважаць нават з вышыні сучаснай свядомасці, то можна заўважыць, што кожная з гэтых простых народных дзіцячых забаў мае пад сабой пазітыўны патэнцыял, мудрасць і сапраўднае цалебнае ўздзеянне – псіхалагічнае ці фізічнае. Лёгка пагадзіцца і з К.Д.Мушынскім, які раіў разглядаць кожны народны твор як «акно», праз якое дзеці бачаць, пазнаюць той ці іншы бок жыцця.

Кожны з апісаных фальклорных вобразаў выконваў свае функцыі і меў свае мэты. Характар жа зваротаў-заклікаў быў розны. Ён мог адпавядаць загаду, патрабаванню («стань у варот», «вынь сурынку»), просьбе («сагрэй чалавечка», «калдуй, баба»), пагрозе («еслі не вынеш, самому засурю»), пытанню («сколькі часоў да вечара») і інш.

Вось якімі мастацкімі формамі і захапляльнымі вобразамі была напоўнена наша дзіцячая рэчаіснасць і наша своеасаблівая рытуальна-магічная практыка. Генетычныя ж вытокі вобразаў ідуць у глыбокую старажытнасць чалавечага існавання. Ды і хто сёння адкажа, якія сілы прыроды ўвасобіліся ў іх? І што гэта за вобразы? Нейкіх вельмі старажытных татэмаў, з якімі звязвалася ў разуменні далёкіх продкаў усё існае ў іх свеце? Або саміх продкаў? Ці якія іншыя?

Лёгка было заўважыць, што мову я імкнулася цытаваць з захаваннем яе асаблівасцей, якія сфарміраваліся ў той памежнай мясцовасці, дзе я нарадзілася і жыла. Мая малая радзіма, па зямлі якой мы разам з табой, чытач, зрабілі падарожжа ў часе, – гэта вёска Ярмоленка Краснагорскага раёна Бранскай вобласці, якая знаходзілася на мяжы з Краснапольскім раёнам Магілёўскай вобласці Рэспублікі Беларусь. Нарадзілася я ў 1958 годзе, а ў 1981 пераехала ў Беларусь, скончыла Магілёўскі педагагічны інстытут, з задавальненнем пасябравала з беларускай мовай, беларускай культурай. Трэба адзначыць, што краснагорска-краснапольская памежная тэрыторыя – рэгіён з цяжкавызначальнай этнічнай прыналежнасцю, тэрыторыя цеснага ўзаемадзеяння і адзінай культурнай прасторы. У гэтым глыбока перыферыйным рэгіёне народная вясковая культура заставалася жывой з’явай і ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. У свеце гэтай культуры, фальклорнага багацця і прайшло маё дзяцінства. Я на ўсё жыццё ўвабрала гэта багацце ў сваё сэрца і памяць, захоўваю яго і з вялікай асалодай дзялюся са сваімі калегамі, землякамі, унукамі і з усімі вамі.

***Валянціна Марчанка,***
***метадыст 1-й катэгорыі РЦК***
***ДУК «ЦКС Краснапольскага раёна»***



# «Восеньская скарбонка»

## сцэнарый фальклорнай праграмы

*Зала ўпрыгожана пад стылізаванную беларускую хату. Таксама на «авансцэне» з натуральных каласкоў зроблена «ніва». З аднаго боку стаіць невялікі куфар. Гучыць беларуская народная музыка. На сярэдзіну залы выходзіць вядучая.*

**Вядучая:** Добры дзень, сябры! Беларуская зямля славіцца сваёй багацейшай старажытнай народнай культурай. Яе старадаўнія традыцыйныя ўзоры дажылі да нашых дзён разам з абрадамі, песнямі, гульнямі, танцамі. Ведаць сваю нацыянальную народную творчасць, родную мову, гісторыю і культуру – гэта значыць не парываць з вытокамі сваёй айчыны, свайго народа.

На працягу стагоддзяў на аснове ўмоў жыцця скаладіся гадавыя абрады і святы беларусаў: зімовыя, веснавыя, летнія, восеньскія.

І сёння мы запрасілі вас да сябе ў госці, каб разам успомніць восеньскія святы і прысвяткі нашых продкаў.

Вось переда мной гэты куфар. Які напоўнены скарбамі. Тут знаходзяцца рэчы – сімвалы восеньскіх святаў. І кожная рэч пакліча нас на свой абрад ці прысвятак. Адкажыце – якія восеньскія народныя святы вы ведаеце? *(адказы)* Ну, а зараз давайце адчынем куфар і дастанем адтуль сімвал верасня. *(дастае серп з куфра).* У мяне у руках серп. Адкажыце, што гэта за прылада такая? Так-так! Сярпом жалі жыта. З зерня потым рабілі муку і пяклі хлеб. А жніво пачыналася з абрада «Зажынкі». І мы запрашаем вас на «Зажынкі»!

*Пад музыку выходзяць старэйшая жанчына і трое дзяўчат.*

**Жанчына** *(аглядаючы «ніўку»)*: Дзяўчаткі, бачыце, жніво ўжо паспела, хадземце зажынаць.

**Першая дзяўчынка** *(абходзіць «ніўку» са словамі)*: Якое жыта наша харошае, ды высокае, каласы налітыя, ды зерне ядронае!

**Жанчына:** Перад тым як жыта зажынаць, давайце левую руку перавяжам чырвонай ніткай, каб не балела рука.



*Дзяўчаты адрываюць ад клубка ніткі, адна адной перавязваюць левую руку.*

**Другая:** Цётка Ганна, вы многа гадоў зажыналі жыта і ніхто ніколі не пакалечыў рукі і не парэзаў пальцы, зажынайце і сёлета.

**Жанчына:** Добра, дзяўчаткі, добра, буду зажынаць.

Ой, да паласа шырокая,
да жыта добрае *(хрысціцца)*.
Госпадзі Божа, дапамажы.
І ты, прысвятая Прачыстая Божая
Маці, памажы жыта зажаці і дажаці.



*Зажынае жыта і засоўвае каласы за пояс.*

**Трэцяя:** Цётка Ганна, а для чаго вы гэта робіце?

**Жанчына:** Каб не балела спіна і гнулася, як гэтыя каласы. Каб хутчэй дажаць жыта. А цяпер, мае дзяўчынкі, пасвячу вас святою вадою, каб даў Бог вам здароўя. Каб рукі і спіна не балелі.

*Жанчына асвяшчае ўсіх жнеек святой вадой.*

**Жанчына:** Дзяўчаты, а зараз давайце нажнём па тры жменькі кожная і зробім першы сноп, упрыгожым яго, каб занесці яго да дому самага працавітага гаспадара нашай вёскі.



*Жнейкі жнуць кожная па тры жменькі. Імітыруюць «вязанне» снапа, стаўшы ў круг. Пры гледачах дзяўчаты ўпрыгожваюць сноп. Затым ставяць сноп на засланы ручнік.*

**Жанчына:**

А я пакладу пад сноп
сыр і хлеб,
а яшчэ медныя грошы
каб ураджай быў харошы.

*Дзяўчаты вядуць карагод вакол снапа.*

**Жанчына**: Жнеечкі, ужо сонца нізка, вечар блізка. Жыта расой пакрылася, пара збірацца да дому, наш першы сноп з поля аднесці.

*Дзяўчаты і Жняя-жанчына пакідаюць сцэну.*



**Вядучая** *(падыходзіць да куфара)*: Дарагія сябры, я зноў зазірну ў куфар! *(дастае сявеньку).* Вось у мяне ў руках сявенька – сюды ссыпалі зерне, ішлі на поле і засявалі яго. А яшчэ гэту сявеньку назвалі ў верасні Багачом, і святкавалі свята – Багач.



Гэта старажытнае свята заканчэння ўборкі зернавых. Жыта з поля сабрана, і будзе хлеб на ўсю зіму! Можна святкаваць. Галоўны атрыбут свята – сявенька, напоўненая зернем. 21-га верасня святкуецца гэта свята.

**Вядучая:** Моладзь у гэты дзень брала сявеньку, напоўненую жытам і па чарзе пераносіла яе ад гаспадара да гаспадара, тым самым жадаючы кожнаму багацця. Лічылася, што Багач-сявенька прыносіць у дом дастатак і шчасце. Таму кожная сям'я яму была рада. Вось давайце паназіраем за гэтым абрадам!

*Уваходзіць Гаспадыня.*

**Гаспадыня** *(гучна)*: Васіль, сыночак, прынясі мне тыя кветкі, што ў збане стаяць.

*Уваходзіць сын з букетам.*

**Сын:** Можа ніхто не прыйдзе, а ты ўсё ўвіхаешся.

**Гаспадыня:** Прыйдуць, абавязкова прыйдуць, ідзі Васілька, апраніся пасвяточнаму. Сёння ж Багач, а я тым часам накрыю стол.

**Сын:** Ды іду ўжо, маці, іду *(выходзіць).*

*Гаспадыня засцілае настольнікам стол, ставіць вазу з кветкамі.*

*За сцэнай чуецца музыка.*

**Гаспадыня:** Васіль, дзе ты падзеўся? Ужо госці ідуць, Багач нясуць.

**Сын:** Іду, маці, іду! *(Выходзіць)*

*Гучыць музыка, выходзяць дзяўчаты. Яны нясуць плеценую лубку з жытам і свечкай пасярэдзіне, зажыначны сноп і кошык.*



**Першая**: Ідзе Багач багаты – адчыняй дзверы, хто яму рады.

**Гаспадыня:** Вельмі рада Багачу. Дзверы адчыніць хачу.

**Другая:** Ідзе Багач чыстымі нівамі, Вязе багаты ўраджай вазамі.

**Трэцяя:**

Прыйшоў багач – кідай рагач.
Бяры сявеньку ды сей памаленьку.

**Першая:** Багача на пачэсны кут адпраўляем. *(Ставіць сявеньку на покуць.)*

**Другая** *(з паклонам):* А вам шчасця, здароўя, дастатку жадаем! Дык няхай жа вам будзе чыста ў полі!

**Трэцяя:** Багата ў хаце! Даўгалецця і згоды!

**Першая:** Век гора не знаці!

**Гаспадыня** *(з паклонам):* Дзякуй, дзякуй, што хату не абышлі!

**Сын** *(з паклонам)*: Добрыя словы для нас знайшлі!



*Дастае з кошыка, які стаіць побач са сталом жбан мёду.*

**Сын:** Дорым вам, госцейкі, збаночак мёду, каб салодка было на дарогу.

**Гаспадыня:** А яшчэ дорым грошы, каб кожны быў прыгожы і харошы.

**Першая**: Дзякуй, дзякуй! Дай Божа, гэтай хаце ніколі дрэннага не знаці!

**Другая:** Каб было чым засяваці, абсяваці!

**Трэцяя:** Ды яшчэ болей жаць, нажынаці.

**Усе разам:** А праз год новага Багача дачакаці!

**Гаспадыня**: Да пабачэня!

*Дзяўчаты пакідаюць сцэну.*

**Вядучая:** Ну, а зараз пагаворым пра другі месяц восені – кастрычнік. А якія святы вы, сябры, ведаеце, што спраўлялі нашы продкі ў кастрычніку? *(адказы).* Дзякуй, давайце пагаворым пра адно яркае свята – Пакроў.

Пакроў – народнае свята глыбокай восені, пасля яго пачыналася зіма. Сяляне стараліся закончыць палявыя работы, усебакова падрыхтавацца да зімы. Пра гэты дзень было шмат прымавак: «Прышлі Пакровы, пытаюцца, ці да зімы гатовы?», «Калі да Пакроваў не было снегу не будзе яго яшчэ два тыдні». Святкавалі Пакроў 14 кастрычніка.

І зараз я зазірну ў наш куфар *(дастае гліняны гарлач і капусту).* Вось гэтыя рэчы сімвалізуюць Пакровы. Чаму?

Пакровы заўсёды чакалі, бо тады было менш работы. І па традыцыі ў вёсках спраўлялі святочныя кірмашы. На кірмаш неслі прадаваць садавіну і гародніну, што вырасцілі дома. Прадавалі гарлачы, свістулькі, талеркі: тое, што рабілі дома. Гаспадыні прадавалі бублікі і цукеркі, піражкі і аладкі.

І зараз да нас завіталі гандляркі восеньскага пакроўскага кірмашу. Сустракайце!

*Гучыць вясёлая музыка. На сцэну выбягаюць гандляркі з кошыкамі, у якіх знаходзіцца тавар.*



**Першая:**
Падбягай, налятай!
Што па густу – купляй!

**Другая:**
Тавары нашы – грошы вашы!

**Трэцяя:**
Што прынеслі – прадавайце!
Што хацелі – набывайце!

**Чацвёртая:**
Калі ласка – гладышы.
Выбірайце для душы.
Малако ў іх налівайце,
Ганчароў успамінайце.

**Пятая:**
Вось капусты качаны,
Кілаграм па шэсць яны!

**Першая:**
Мы добрыя гаспадыні,
У нас поўныя скрыні.
Міскі фарбаваныя,
Прыгожыя, маляваныя.

**Другая:**
Цыбуля золатам гарыць,
Пад сонцам шчыра зіхаціць.
Павязана ў вязанкі як быццам абаранкі…

**Трэцяя:**
Пірагі ды плюшкі,
Абаранкі, сушкі…
Грошай многа не бяру,
Амаль дарам прадаю.

**Чацвёртая:**
Паглядзі часнок які
Вырасцілі людзі,
Ежа з гэтым часнаком
Вельмі смачнай будзе.

**Пятая:**
Нашы дошкі распісныя!
Паглядзіце – вось якія!

**Першая:**
Пірагі і пернікі.
ласункам усім сапернікі!

**Другая:**
Паглядзіце, калі ласка –
тут і сала, і каўбаска!

**Трэцяя:**
Аладкі! Аладкі! Для дзеда і бабкі!
Для малых рабятак по сто рублёў дзесятак!

**Вядучая:** Вельмі добры тавар у вас, ганляркі! Дай вам Божа, шмат гадоў пажыці. Цераз дзень, цераз два на кірмаш хадзіці!

*Дзяўчаты пад музыку пакідаюць сцэну.*

**Вядучая:** А яшчэ на кірмашах ладзіліся гульні і забавы. І зараз я запрашаю вас на гульню «Мікітаў лапцік».

*Праводзіцца гульня.*

**Вядучая:** Сябры, і яшчэ адна гульня, у якую гулялі нашы продкі. Яна называецца «Слуцкія паясы». Запрашаю вас на гульню!

*Праводзіцца гульня.*

**Вядучая:** Дзякую ўсім! І давайце зноў зазірнём у наш куфар *(дастае адтуль кудзелю, клубок нітак, вышываны ручнік, саматканы пояс).* У мяне – сімвалы свята трэцяга месяцы восені лістапада. Паглядзіце, калі ласка! Менавіта 14 лістапада спраўлялі Кузьмінкі. Дзень

шанавання святых Кузьмы і Дзям'яна. Гэта свята сустрэчы зімы і праводзін восені. Раней казалі: «Кузьмінкі – па восені памінкі». Святыя браты Кузьма і Дзям'ян лічыліся пакравіцелямі кавалёў і дзяўчат-рукадзельніц.

Свята гэта рамяства,
дамашняга ачага,
свята не бяздзелля.
Свята рукадзелля!



Вось таму я і дастала з куфра такія цудоўныя вырабы ручной работы.

На Кузьмінкі дзяўчаты збіраліся разам у каго-небудзь дома, бралі з сабой вязанне, вышыўку і праводзілі вечары за рамяством і бяседай.

І заўсёды ў гэты дзень стараліся зрабіць абярэг для дома, для сваіх родных, для сябе. І самыя папулярныя абярэгі ў нашых продкаў былі – лялькі і паясы.

*Гучыць лірычная музыка.*

**Вядучая:** У сем'ях беларусаў здаўна было шмат лялек. Адны аберагалі дамачадцаў, другія навучалі дзетак, трэція лячылі, а з чацвёртымі дзеткі проста забаўляліся. І менавіта на Кузьмінкі абярэжныя лялькі выраблялі без адзінай іголачкі і нажніц, яны адвадзілі ад сям'і сурокі і чары. У нашых продкаў была амаль сотня лялек на ўсе выпадкі жыцця.

Мы пакажам вам некалькі лялек-абярэгаў, што зрабілі ў нашым гуртку дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Чудеса в сундучке».

*Выходзяць па чарзе дзяўчынкі з лялькамі ў руках. Вядучая расказвае пра кожную ляльку. Дзяўчынкі дэманструюць лялькі гледачам.*

**Вядучая:** Перед намі – лялька-абярэг Траўніца. Яна сочыць за тым, каб хвароба не пракралася ў хату. Ад яе вея цеплынёй, як ад клапатлівай гаспадыні. Лялька і аберагае ад злых духаў хваробы, і добрая суцяшальніца. Лялька напоўнена духмянай лекавай травой. Калі пацерці такую ляльку ў руках, па пакоі разнясецца травяны водар, які адгоніць духаў хваробы.

Матулі, адпраўляя дзяцей у дарогу, акрамя благаслаўлення давалі ім ляльку-абярэг з катомкамі ў руках. У такіх катомках знаходзілася родная зямля, а лялька называлася Падарожніцай. Калі рабілі такую ляльку, то чыталі малітвы. Лічылася, што тады лялька будзе мець магічную сілу. І кожны падарожнік заўсёды адчуваў падтрымку ад такога абярэга.

Восенню ў хаце нашых прадзедаў, як правіла, з'яўлялася лялька Зернавушка ці Крупенечка. Зерне ці крупы насыпалі ў мяшочкі і рабілі з іх лялькі. Лялька-бочачка захоўвала ў сабе зерне ўсю зіму. Яе давалі пагуляць дзецям, каб зерне ці крупа назапасілі жыццёвую энергію. А ўвесну, калі пачыналі сеяць, стараліся кінуць у глебу хоць колькі зярнятак з лялькі. Тады будуць добрыя ўсходы.

Нашы лялькі – гэта абярэгі для аховы хатняга ачагу ад злых духаў, ад нягод і бед, для захавання добрага настрою. Дом, дзе ёсць такі абярэг, заўсёды напоўнены радасцю і весялосцю!

*Удзельніцы гуртка пакідаюць сцэну.*

**Вядучая:** А зараз мы з вамі палюбуемся на вырабы ўдзельніц клуба «Золотая нить», якія менавіта да Кузьмінак гэтага года выткалі паясы.

Пояс у традыцыйнай культуры беларусаў з'яўляўся значным і выключна шмат функцыянальным прадметам. Ён быў неабходным кампанентам адзення, выконваў разнастайныя сімвалічныя і абрадавыя функцыі, а таксама выкарыстоўваўся ў побыце ў розных мэтах.

У традыцыйным касцюме пояс выконваў адразу некалькі функцый: практычную, сімвалічную, магічную, этычную, знакавую, эстэтычную. Па поясу можна было даведацца аб месцы жыхарства чалавека.

На сцэну выходзяць дзяўчаты з паясамі. Яны вядуць карагод. І калі вядучая расказвае пра пояс, кожная дзяўчынка прэзентуе гэты пояс.

**Вядучая:** Перад вамі пояс Быхаўскага раёна. Дэкаратыўная кампазіцыя нашага пояса ўяўляе сабой шанаванне любові да роднага краю. Па сярэдзіне пояса: рака Днепр – сімвал вады, а па баках сімвалы роднай прыроды: лясы, лугі і палі.

Узор наступнага пояса ўяўляе сабой своеасаблівы гімн ураджаю. Тут вобраз урадлівасці маці-Зямлі. Жнеі абвязваліся поясам з гэтым узорам і затыкалі за яго серп ішоўшы на жніво.

А вось гэты ўзор вытканы не толькі для прыгажосці, ён яшчэ і вучыць маладых хлопцаў і дзяўчат, каб яны слухалі старых людзей, вучыліся ў іх розуму. А завецца гэты ўзор «дзедам» ці розумам. Калі хочаш па-сапраўднаму ўшанаваць сваіх продкаў, трэба выткаць вось такі ўзор. І надзявалі такія паясы на памінальную вячэру, на Дзяды.

Ахоўная роля тканых паясоў асабліва ярка выяўлялася ў часы ўсенароднага бедства: вайны, засухі, неўраджаю. І надзявалі нашы дзяды і прадзеды вось такі пояс, як свяшчэнны знак, своеасаблівы абярэг ад хвароб і нячысцікаў.

Рэкі ў жыцці нашых продкаў адыгрывалі яркую ролю, сяліліся беларусы на берагах рэк, карміліся з іх, рэкі былі для іх дарогамі. І калі трэба было набраць вады з жыватворнай крыніцы, павязвалі вось такі пояс, з узорам вады.

А вось такі пояс надзявалі дзяўчаты, калі ішлі на ўзгорак вясну загукаці. Тут узор урадлівасці і жыццёвых сіл прыроды.

Высокае духоўнае пачуццё – каханне – канчатковай мэтай ставіла стварэнне сям'і. На гэтым поясе вытканы ўзор кахання, шчаслівай сямейнай долі. Такі пояс у падарунак атрымлівалі жаніх і нявеста ад сваіх бацькоў.

*Дзяўчаты пакідаюць сцэну.*

**Вядучая:** Восень багата на святы і абрады. А дзе свята – там і песня! І няхай песня, якая зараз прагучаць, пакіне ў нашым сэрцы толькі добрыя ўспаміны пра восень гэтага года. Сустракайце! На сцэне – народны ансамбль «Дняпроўскія зоры». Выконваецца песня на словы Д.Алешкі «Давайце сабярэмся разам!».

**Вядучая:** Вось і закончылася наша сустрэча. Да пабачэння!

*Гучыць беларуская мелодыя. Вядучая развітваецца з гледачамі.*

***А.А.Байкова,***
***мастацкі кіраўнік***
***Цэнтра культуры, народнай творчасці і рамёстваў***

# ДАМАШНІЯ АБЯРЭГІ

## сцэнарый фальклорнай праграмы

**Дзеючыя асобы:** *Вядучая, Гаспадар, Гаспадыня, старэйшая дачка Алена, малодшая дачка Васіліна.*



**Рэквізіт:** *саламяны «павук», ваза і галінкі вярбы, лялька Траўніца, тканыя паясы, драўляная птушка, драўляная фігурка мядзведзя, падкова, «закладкі» для кніг.*

*Пляцоўка, дзе праходзіць мерапрыемства, афармлена пад сялянскую хату: «чырвоны кут», «бабін кут», «мужчынскі кут», сама «хата» ўпрыгожана дыванам, ручнікамі, посцілкамі, на стале – абрус.*

*Выходзіць вядучая.*

*Гучыць лірычная беларуская мелодыя.*

**Вядучая:** Добры дзень! Дарагія сябры! Мы запрасілі вас на незвычайную праграму, якая носіць назву «Хатнія абярэгі». А што такое «абярэг»? *(адказы гледачоў).*

**Вядучая:** Так. Абярэг – гэта прадмет, які валодае здольнасцю аберагаць чалавека ад розных бедстваў і напасцяў. Давайце зазірнем у «хату» нашых продкаў і даведаемся, як людзі абараналі сябе і сваё жытло.

Абярэгі для сям'і былі ў кожным доме, і кожная гаспадыня дакладна ведала, з дапамогай чаго можна зберагчы прастору ад хвароб, няшчасцяў, сурокаў, як прыцягнуць у дом багацце і дабрабыт. І ў наш час абярэгі для дома не страцілі значнасць, многія гаспадыні выкарыстоўваюць веды прабабуль, якія дапамагаюць забяспечыць мір і росквіт у сям'і. Ролю сямейнага талісмана могуць выконваць абсалютна розныя атрыбуты, якія дайшлі да нас са старажытных часоў і даказалі сваю карысць.

Такім чынам, зазірнем у хату нашых прабабуль і прадзядуль.

*Гучыць беларуская мелодыя.*

*У «хату» па чарзе ўваходзяць персанажы і займаюць свае месцы.*

**Вядучая:** Давайце знаёміцца: гаспадар гэтага дома – Ігнат *(мужчына займае месца ў працоўным кутку хаты).* Гаспадыня – Акуліна *(жанчына займае месца ў «чырвоным куце» хаты).* Старэйшая дачка – Алёна *(дзяўчына займае месца ў «бабіным кутку» хаты).* І малодшая дачка – Васіліна *(дзяўчынка становіцца побач з вядучай).*

І зараз мы разам з Васілінай пазнаёмімся з хатнімі абярэгамі. Даўней хата дзялілася на асобныя зоны, якія ў народзе называлі «кутамі»: «чырвоны кут», «бабін кут» – месца

каля печы, дзе гаспадыня займалася жаночымі справамі.

«Чырвоны кут» быў своеасаблівым сакральным месцам у сялянскай хаце, дзе стаяў стол, а зверху вісеў абраз. Покуць мела найбольшае значэнне ў рытуальнай сістэме жыцця сялянскай хаты, з'яўляючыся найбольш каштоўнай у абрадавым сэнсе часткай хаты. Менавіта тут знаходзіліся галоўныя абярэгі для сям'і. У гэтым куце знаходзіліся абразы, малельныя кнігі, свянцоныя свечкі. Тут на скрыжаванні лаў у многіх хатах ставілі хлебную дзяжу як сімвал дастатку і дабрабыту. У час абраду зажынак і дажынак першы і апошні снапы ставілі на пачэснае месца ў чырвоным куце.

*Маці-гаспадыня бярэ ў рукі саламянага «павука», да яе падыходзіць Васіліна.*



**Маці:** Ну вось, Васіліна, хутка Каляды. Давай з табой вось гэтага саламянага «павука» павесім у галоўным «чырвоным кутку» нашай хаты.

**Васіліна:** Мама, а сапраўды: гэтая канструкцыя так падобная на павуцінне. Толькі вось навошта гэтае «павуцінне» ў «чырвоны кут» вешаць?

**Маці:** А вось у яе, у гэтую «павуцінку» хай убярэцца ўся негатыўная энергія нашага дома. Павучок гэты павісіць тыдзень да Каляд, убярэ ў сябе наш дрэнны настрой, крыўды, хваробы, а потым мы яго спалім. І разам з ім хай згарыць усё дрэннае.

*Гучыць лірычная музыка. Мама і дачка вешаюць «павука».*

**Маці:** Ну вось, гэты саламяны «павук» будзе ахоўваць нас, прыносіць шчасце, і ў той жа час упрыгожыць наш дом на ўсе Каляды. А ў вазачку давай паставім галінкі вярбы ад Вербнай нядзелі.

**Васіліна:** А для чаго сухія галінкі ў хаце?

**Маці:** Вярба – старажытны сімвал вясновага адраджэння прыроды. Гэтыя галінкі я ў царкве асвяціла, бо наш народ прыпісваў вярбе асаблівыя ўласцівасці, якія даюць сілы і здароўе.

**Васіліна:** А, вось чаму ты мяне гэтымі галінкамі «сцягала»!

**Маці:** Ну, так! Каб ты здаравенькай расла.

*Ставяць вазу з галінкамі ў «чырвоны кут», каля абраза.*

**Маці:** А цяпер падай-ка мне вунь тую лялечку. Яе ўчора бабуля для нас змайстравала і прынесла.

**Васіліна:** Ой, якая яна прыгожая! Можна я з ёй пагуляюся?

**Маці:** Не, з гэтай лялькай нельга гуляць. Гэтая лялька будзе засцерагаць нас ад хвароб, яна так і называецца – Траўніца.

**Васіліна** *(мне ляльку ў руках і нюхае):* І сапраўды! Яна травамі напоўнена.



**Маці:** І ўсе травы лекавыя: тут сухі рамонак, крапіва, кветачкі ліпы, лісточкі маліны і суніцы. Мы яе паставім каля вакенца *(або знайсці месца)* і водар траў загубіць усе мікробы.

**Васіліна:** Маці, а чаму лялька без твару?

**Маці:** Лялька без твару лічыцца – нежывой. Менавіта праз твар злыя сілы ўсяляліся ў людзей. А ў безаблічную ляльку зло не ўвойдзе. Людзі верылі, што лялькі забіраюць хваробы і прыносяць здароўе, любоў і шчасце.

*Мама і Васіліна ўсталёўваюць ляльку.*

**Вядучая:** А цяпер давайце зазірнем у працоўны «бабін кут» хаты. Тут сястра нашай Васіліны, Алёна, тчэ паясы. А пояс для нашых продкаў меў значную ролю: ён быў не толькі элементам



адзення, ён ахоўваў і абараняў чалавека. Пояс выкарыстоўвалі ў многіх абрадах. А ўзоры на паясах таксама мелі абярэгавы сэнс.

*Васіліна падыходзіць да сястры, садзіцца побач з ёй на лаву.*

**Васіліна:** Сястрыца, а каму ты паясы такія прыгожыя робіш?

**Алена:** Дык усім нам! Вось глядзі – гэты пояс я маме выткала. У канцы лета яна пойдзе ў поле жаць пшаніцу, і павяжа яго. Пояс дапаможа нашай маці ў цяжкай працы, і спіна ў маці не будзе хварэць. А вось гэты пояс *(паказвае)*



я для нашага бацькі выткала. Бацька па вясне пачне капаць калодзеж – жыватворную крыніцу, таму пояс з узорам вады яму дапаможа хутчэй знайсці крынічны ключ.

